ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г.

27 САКАВІКА

ЧАЦВЕР

№ 11 (1275)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

## НАВІНЫ БДУ

### СТАЛА ТРАДЫЦЫЯЙ

праводзіць на гістарычным факультэце балгара-савецкія студэнцкія навуковыя канферэнцыі. На днях адбылася чарговая сёмая канферэнцыя, прысвечаная 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 35-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Аб уплыве партыі Леніна на балгарскі рэвалюцыйны рух расказаў Міхаіл Стралец (даклад «У. І. Ленін і Балгарыя»). Пра баявую садружнасць савецкага і балгарскага народаў у гады Вялікай Айчыннай вайны расказала Ларыса Быкава. Затым з навуковымі работамі выступілі балгарскія студэнты. Тадорка Вылева расказала аб вернасці ленінскім ідэям інтэрнацыяналізму, а Мікалай Стаіменаў — пра супрацоўніцтва Ленінскага і Дзімітраўскага камсамола.

### У СЯБРОЎСКАЙ АТМАСФЕРЫ

прайшоў вечар, прысвечаны 159-й гадавіне грэчаскай рэвалюцыі 1821 года, які правядзілі сумесна камітэт камсамола журфака і грэчаскае зямляцтва. Аб гісторыі Грэцыі, яе мужных рэвалюцыянерах, нацыянальных героях расказала другакурсніца факультэта журналістыкі Кацярына Дуру. Са святам студэнтаў з Грэцыі павіншавалі прадстаўнікі польскага і кубінскага зямляцтваў, савецкія студэнты. Пасля адбыўся святочны канцэрт, у якім гучалі грэчаскія народныя песні.

### КАМІТЭТАМ КАМСАМОЛА

Белдзяржуніверсітэта праведзена навукова-практычная канферэнцыя «Формы і метады работы камсамольскіх арганізацый па паляпшэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў», прысвечаная 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна і 60-годдзю камсамола Беларусі.

Пленарнае пасяджэнне адкрыў прарэктар па вучэбнай рабоце В. Г. Ціхіня. Потым выступіў сакратар Маскоўскага РК ЛКСМБ Г. Д. Хухлындзін. Ён расказаў аб задачах камсамольскіх арганізацый па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў». Прайшлі пасяджэнні секцый, дзе былі разгледжаны формы і метады работы камсамольскіх арганізацый з выдатнікамі, са студэнтамі першага курса, са слухачамі падрыхтоўчых аддзяленняў і рабочай моладдзю.

ТВАЕ ПРАПАНОВЫ, СТУДЭНТ!

## Алімпіяда набліжаецца

АЛІМПІЯДА «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» пачала праводзіцца нядаўна. Аднак ужо зараз можна зрабіць некаторыя вывады аб тым, як палепшыць якасць выступленняў каманд нашага універсітэта на II (рэспубліканскім) туры.

Справа ў тым, што на некаторых факультэтах каманды па прадметах складаюцца па курсавому прынцыпу. Так, на хімічным факультэце каманда па неарганічнай хіміі складаецца са студэнтаў I курса, па аналітычнай хіміі — са студэнтаў II курса, па фізічнай хіміі — са студэнтаў III курса. Такім чынам, большасць студэнтаў IV і V курсаў, акрамя тых чацвёртакурснікаў, якія спецыялізуюцца па арганічнай хіміі і з ліку якіх складаецца каманда па гэтаму прадмету, пазбаўлены магчымасці ўдзельнічаць у гэтым важным мерапрыемстве. Аднак якасць выступлення каманд толькі палепшыцца, калі ў іх будуць уключаны старшакурснікі, якія спецыялізуюцца па гэтых прадметах. Уключэнне студэнтаў старэйшых курсаў у каманды разам з малодшакурснікамі не пярэчыць «Палажэнню аб алімпіядзе», таму іх уключэнне ў каманды патрэбна разглядаць як нявыкарыстаны да гэтай пары рэзерв.

Для павышэння зацікаўленасці студэнтаў ва ўдзеле ў алімпіядзе «Студэнт і НТП» неабходна гарантаваць пераможцам хаця б другога тура выдатныя адзнакі па тых прадметах, па якіх яны занялі першыя месцы. Такая сістэма ўжо прынята на ўзбраенне ў іншых ВНУ рэспублікі (МДМІ, БТІ імя С. М. Кірава, МДПІ імя А. М. Горкага і іншых).

Для ўзмацнення падрыхтоўкі членаў каманд патрэбна прадаставіць удзельнікам (уключаючы запасных) трохдзённы адпачынак, на працягу якога яны змогуць падрыхтавацца да выступлення, асвяжыць у памяці асноўныя метады рашэння задач, прачытаць неабходную літаратуру і г. д.

Акрамя гэтага, для прыцягнення таленавітых студэнтаў да ўдзелу ў алімпіядзе «Студэнт і НТП» неабходна шырэй прапагандаваць дасягненні каманд нашага універсітэта ў рэспубліканскім туры.

Можна спадзявацца, што пасля рэалізацыі гэтых прапаноў выступленні нашых каманд стануць больш паспяховымі. Пры гэтым нельга забываць, што вынікі студэнтаў на алімпіядзе ў некаторай ступені характарызуюць якасць ведаў і падрыхтоўку будучых працаўнікоў народнай гаспадаркі. Таму патрэбна прыкласці ўсе намаганні для таго, каб колькасць студэнтаў, якія ўдзельнічаюць у першым туры алімпіяды, павялічылася, а якасць выступленняў нашых студэнтаў у другім туры палепшылася.

**А. ВЕЧАР,**
**студэнт хімічнага факультэта, старшыня НСС.**

## ВЕРНАСЦЬ МАРЫ І ПРЫЗВАННЮ

ЧАЛАВЕК абраў сваю прафесію. Аднойчы і назаўсёды. Але кожны новы дзень прыносіць і дабаўляе разам са сваёй непаўторнасцю ўсё новыя штрыхі да яе рамантычнага вобраза, ствараючы амаль заўсёды сваю асаблівую адметнасць, зачараванасць. У гэтым было лёгка пераканацца, пабываўшы на сустрэчы студэнтаў педагагічнага патока IV курса фізічнага факультэта з настаўнікамі школ горада Мінска. Прысутныя гасцінна сустрэлі сваіх старэйшых калег, якія ўжо на працягу многіх гадоў вядуць нястомную выкладчыцкую і выхаваўчую работу. З увагай слухалі студэнты выступленні заслужанага настаўніка БССР, настаўніка фізікі СШ № 1 Анатоля Міхайлавіча Качынскага, выдатніка народнай асветы БССР, намесніка дырэктара па вучэбна - выхаваўчай рабоце СШ № 1 Міхаіла Фёдаравіча Валатковіча, настаўніка фізікі СШ № 3 Юрыя Дзмітравіча Ляшчынскага, дырэктара СШ № 44, настаўніка фізікі Канстанціна Іванавіча Гушчынскага, якія падзяліліся багатым педагагічным вопытам, сакрэтамі свайго педагагічнага майстэрства. Выступаючым прыйшлося адказаць на шматлікія пытанні аўдыторыі наконт будучай прафесіі, работы з дзецьмі, праблем узаемаадносін настаўнікаў і вучняў.

Хочацца верыць, што хутка ў перадавы атрад будаўнікоў камунізму, да якога належыць наша настаўніцтва, увальецца дастойнае папаўненне з ліку гэтых і многіх іншых хлопцаў і дзяўчат, якія засталіся вернымі сваёй мары і свайму прызванню.

**В. КАРПІК,**
**студэнт I курса журфака,**
**В. ЧЫМБАР,**
**студэнтка IV курса фізфака.**



## Адзін дзень факультэта

ФОТАРЭПАРТАЖ

Ведаць мінулае грамадства і разумець свет сучасны, каб прадбачыць будучыню,—так вызначаецца задача сучаснага гісторыка.

Гістарычны факультэт быў створаны ў 1934 годзе. У той час тут было толькі чатыры кафедры. У 1937 годзе пачалі працаваць яшчэ дзве кафедры і аспірантура. У пасляваенны час узніклі два аддзяленні—палітэканоміі і філасофіі.

Гістфак сёння — гэта 14 кафедр, факультэцкіх і агульнауніверсітэцкіх, каля 2 тысяч студэнтаў, звыш 350 з якіх займаюцца ў навукова-даследчых гуртках. Гэта і практыкі: азнаямленчая, педагагічная, піянерская і іншыя. Асаблівую цікавасць у студэнтаў выклікае археалагічная практыка, якую яны праходзяць пасля першага

(Працяг на 2-й стар.).



## Прафсаюзны тэлетайп

ЖУРФАК

**ГЭТЫ ДЗЕНЬ** не адзначаны ў календары чырвонай лічбай. Але для ўсіх савецкіх людзей 22 красавіка — самае светлае свята. Аб гэтым сведчыць тая вялікая падрыхтоўка, што вядзецца да 110-й гадавіны з дня нараджэння У. І. Леніна.

На журфаку таксама рыхтуюцца да гэтай даты. Камсамольцы актыўна ўдзельнічаюць у суботніках, праводзяцца ленінскія чытанні. Герой Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі прачытаў лекцыю аб ленінскай тэорыі абароны сацыялістычнай Айчыны, а выкладчык факультэта У. І. Дубовік выступіў з дакладам «Ленін як публіцыст».

У інтэрнаце № 2, дзе жывуць студэнты-журналісты, афармляецца ленінскі пакой. 110-й гадавіне з дня нараджэння Ільіча будзе прысвечаны спецвыпуск інтэрнацкай газеты.

Л. ЦУКАНАВА.

ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ

**ДОБРЫ ПАДАРУНАК** атрымалі студэнты радыёфізічнага факультэта. На днях яны перасяліліся ў новы вучэбны корпус, дзе будуць праходзіць тэарэтычныя заняткі.

Практычныя работы радыёфізікі будуць выконваць у другім корпусе. Тут размясціліся лабараторыі з сучаснай тэхнікай.

* *

**СТУДЭНТЫ РЫХТУЮЦЦА** да свята — Дня радыёфізікі. За пяць гадоў свайго існавання гэта мерапрыемства праводзіцца ўпершыню. На працягу трох дзён будуць гучаць вясёлыя песні, жарты, праведзены цікавыя віктарыны. На свята студэнты-радыёфізікі запрасілі сваіх калег з Казанскага, Днепрапятроўскага, Кіеўскага, Харкаўскага універсітэтаў.

* *

**ПЕРШАЯ ГРУПА** 3-га курса правяла грамадска-палітычную атэстацыю. Студэнты падрыхтаваліся да яе выдатна. З 30 чалавек 26 атэставаны вышэйшай адзнакай. Гэта адна з лепшых груп. Зімовую сесію 20 студэнтаў здалі без троек.

А. ВАСІЛЬКЕВІЧ.

# АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

ФОТАРЭПАРТАЖ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

курса. Першая практыка — гэта і рамантыка нязведанага, непасрэднае сутыкненне з мінулым краіны, і тэмы для курсавых і нават дыпломных работ.

Вось, напрыклад, Аляксандр Літвін, студэнт 5-га курса. Ён пачаў працаваць над тэмай дыпломнай работы «Зброя з раскопак феадальных замкаў Старажытнай Русі» ў час археалагічнай практыкі, якая праходзіла ў Рагачове. Цяпер у яго калекцыі знаходзіцца зброя з розных курганоў перыяду Кіеўскай Русі: Стрэшына, Копасі і іншых. Але не толькі зброя цікавіць Аляксандра. Паралельна ён распрацоўвае ў сваёй дыпломнай тэму феадальных замкаў, якія ў летапісу названы гарадамі.

Ёсць на факультэце археалагічны музей, у якім рыхтуецца да паказу экспазіцыя старажытных манет, знойдзеных экспедыцыяй пад кіраўніцтвам дацэнта Эдуарда Міхайлавіча Загарульскага.

Хутка агляд мастацкай самадзейнасці. Творчая група факультэта прыкладае ўсе намаганні, каб зноў дабіцца мінулагодняга поспеху і заняць першае месца ў конкурсе.

(Заканчэнне на 3-й стар.).





# ТОЛЬКІ ШЛЯХАМ ПОШУКУ

ПАСТАНОВА ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы», Усесаюзная нарада ідэалагічных работнікаў (кастрычнік 1979 года), пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў» (ліпень 1979 года) абавязваюць партыйныя, камсамольскія арганізацыі, педагагічныя калектывы ВНУ ўзмацніць увагу да ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў, палепшыць работу па фарміраванню ў іх «неабходных якасцей будучага выхавацеля і арганізатара, прапагандыста камуністычных ідэй». У рашэнні гэтай задачы вялікую ролю заклікана іграць далейшае ўдасканаленне грамадска-палітычнай практыкі (ГПП), развіццё форм і метадаў паўсядзённага кіраўніцтва ёю.

Перш за ўсё, трэба палепшыць арганізатарскую работу саветаў па ГПП, саветаў куратараў, камсамольскіх арганізацый на этапе распрацоўкі і зацвярджэння комплексных планаў па Ленінскаму заліку і ГПП. На некаторых факультэтах (біялагічны, хімічны, гістарычны, факультэт журналістыкі) за прайшоўшыя 2—3 гады ўжо дасягнуты пэўныя вынікі ў паляпшэнні гэтай работы. На біялагічным факультэце, у прыватнасці, быў распрацаваны і ўкаранёны пералік грамадскіх даручэнняў па ГПП з улікам спецыфікі факультэта, на аснове якога студэнты складаюць асабістыя комплексныя планы. Акрамя даручэнняў, агульных для студэнтаў усіх спецыяльнасцей, значнае месца ў гэтым пераліку адводзіцца рабоце па стварэнню гурткоў «Юны біёлаг», «Юныя сябры прыроды» ў школах Мінска, у месцах праходжання студэнтамі летняй вучэбнай і вытворчай практык, удзелу студэнтаў у рабоце дружыны па ахове прыроды. Студэнты па лініі ГПП ужо з першага курса працуюць у школах і ПТВ. Яны вядуць ідэйна-выхаваўчую, культурна-масавую работу, дапамагаюць адстаючым у вучобе.

У ліку даручэнняў на гістарычным факультэце вялікая ўвага ўдзяляецца падрыхтоўцы студэнтаў да лекцыйна-прапагандысцкай работы ў навучальных установах, у рабочых, студэнцкіх і вучэбных інтэрнатах; арганізацыі краязнаўчай работы ў школах па месцу праходжання практыкі, у археалагічных экспедыцыях, ідэйна-выхаваўчай і культурна-масавай рабоце сярод мясцовага насельніцтва па месцу дыслакацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў; вучобе студэнтаў у школе маладога лектара, на факультэце грамадскіх прафесій.

**Заслугоўвае ўвагі вопыт дэталёвай падрыхтоўкі студэнтаў да распрацоўкі асабістых комплексных планаў па Ленінскаму заліку на факультэце журналістыкі. На факультэце ўпэўніліся, што для павышэння якасці планаў і эфектыўнасці ГПП у цэлым перш за ўсё неабходна глыбокае вывучэнне студэнтамі палажэння аб ГПП, яго прынцыпаў і патрабаванняў. На гэтай аснове на факультэце ўведзены для студэнтаў усіх курсаў залік па палажэнню аб ГПП. Вядома, гэта павысіць якасць асабістых комплексных планаў. Думаецца, было б мэтазгодным не толькі ўвесці такі залік на ўсіх факультэтах, але правесці на курсах, у акадэмічных групах цыкл гутарак па асноўных раздзелах палажэння. Вывучэнне палажэння і залік па яму, па нашаму меркаванню, мэтазгодней праводзіць у першым семестры, разглядаючы гэта ў якасці асноўнай формы ўдзелу першакурснікаў у ГПП.**

У рабоце на этапе распрацоўкі асабістых комплексных планаў, як нам уяўляецца, ёсць і пэўная недахопы. Не садзейнічае павышэнню якасці планаў недастатковая аператыўнасць грамадскіх кафедр па выкананню ўскладзеных на іх абавязкаў. Палажэннем аб ГПП прадугледжваецца распрацоўка і штогадовае абнаўленне рэкамендацыйных спісаў дадатковай літаратуры па грамадскіх навуках для самастойнай работы студэнтаў. На жаль, гэта работа вядзецца не ўсімі кафедрамі і не на ўсіх факультэтах. Прычым, як паказвае вывучэнне асабістых комплексных планаў студэнтаў, на некаторых факультэтах (фізічны, механіка-матэматычны, біялагічны) гэтыя спісы складаюцца з парушэннямі патрабаванняў палажэння аб ГПП. У спісы літаратуры ўносяцца абавязковыя па праграме грамадскіх навук работы, а тэмы рэфератаў часта прапануюцца такія, па якіх вельмі цяжка падрыхтаваць лекцыю ці даклад і выступіць з імі перад аўдыторыяй. З такімі рэфератамі студэнты наогул не выступаюць, нават перад аднакурснікамі. У большасці асабістых комплексных планаў наогул адсутнічаюць дакладныя назвы тэм рэфератаў і назвы работ для самастойнага вывучэння. Запісваюцца пункты: «вывучаць работы класікаў марксізму-ленінізму», «напісаць рэферат па грамадскіх навуках», «выступіць з дакладам на студэнцкай навуковай канферэнцыі» і г. д. без вызначэння іх тэм і назваў. Гэта, вядома, ні да чаго не абавязвае, і ў большасці выпадкаў яны не выконваюцца.

На некаторых факультэтах не для ўсіх студэнтаў знаходзіцца дастаткова сапраўды важных і патрэбных грамадскіх даручэнняў, і даводзіцца згаджацца з наяўнасцю ў комплексных планах фармальных даручэнняў, не патрабуючых ад студэнта асабістай ініцыятывы.

**Дакладна арганізаваная работа па распрацоўцы асабістых комплексных планаў з'яўляецца важнейшым этапам ГПП. Аднак рашаючую ролю ў яе правядзенні, у выкананні ўзятых абавязацельстваў заклікана іграць паўсядзённае кіраўніцтва ГПП, пастаянны кантроль за яе ходам, своечасовая дапамога студэнтам у пераадоленні ўзнікшых цяжкасцей.**

У гэтым плане на факультэтах робіцца шмат. Асаблівай увагі заслугоўвае вопыт стварэння на механіка-матэматычным і факультэце журналістыкі пастаянна дзейнічаючых камісій па ГПП на курсах і кафедрах, на якія ўскладзены абавязак не толькі праводзіць атэстацыю, але і кіраваць ходам ГПП, здзяйсняць паўсядзённы кантроль за выкананнем комплексных планаў. На факультэце журналістыкі добра пастаўлена асвятленне ходу ГПП у насценным друку, зроблены стэнд. На ўсіх факультэтах ход ГПП сістэматычна заслухоўваецца на партыйных і камсамольскіх сходах.

Тым не менш у арганізацыі паўсядзённага кіраўніцтва за ходам ГПП ёсць шэраг нявырашаных праблем.

Так, не вырашана пытанне аб рэцэнзаванні рэфератаў па грамадскіх навуках, аб дапамозе студэнтам у падрыхтоўцы лекцый і дакладаў па матэрыялах рэфератаў, у арганізацыі выступленняў. Не зусім правільна ўскладаць усю гэту работу на аднаго выкладчыка грамадскай кафедры, бо ён вядзе свой прадмет на 2—3 факультэтах і фізічна не ў стане якасна адрэцэнзаваць некалькі соцень рэфератаў. Думаецца, партыйным бюро і саветам па ГПП факультэтаў трэба прыйсці на дапамогу выкладчыкам грамадскіх навук, прыцягваючы да гэтай работы выкладчыкаў іншых прадметаў і студэнтаў старэйшых курсаў гуманітарных факультэтаў. Рашэнне гэтага пытання наспела, паколькі, як вядома, значная колькасць рэфератаў да гэтага часу не выкарыстоўваецца ў лекцыйна-прапагандысцкай рабоце студэнтаў.

Яшчэ не распрацаваны дастаткова выразныя формы і метады паўсядзённага кантролю за ходам выканання кожным студэнтам абавязацельстваў і заданняў яго асабістага комплекснага плана. Работа многіх студэнтаў застаецца па-за полем зроку куратараў, камсамольскіх органаў, саветаў па ГПП. Размова з імі па выкананню абавязацельстваў, як відаць з дакументацыі па ГПП і з гутарак са студэнтамі, вядзецца толькі перад атэстацыяй. Як нам уяўляецца, здзяйсненне пастаяннага кантролю за якасцю выканання абавязацельстваў студэнтамі не можа быць эфектыўным без аб'яднання намаганняў куратараў, камсамольскіх органаў і саветаў па ГПП. Ім патрэбна сумесна планаваць гэты кантроль. На кожнае пасяджэнне камсамольскага камітэта курса, кафедры, на кожны камсамольскі сход групы, кожнае пасяджэнне савета па ГПП трэба ставіць справаздачы студэнтаў, камсоргаў, адказных за ГПП членаў камсамольскіх камітэтаў аб ходзе выканання абавязацельстваў асабістых комплексных планаў. Аб недастатковай увазе да пытанняў кантролю гавораць, часткова, факты адсутнасці ў камітэтах камсамола некаторых факультэтаў асабістых комплексных планаў студэнтаў. Мінімальным, думаецца, патрабаваннем павінна быць прынцыповая размова з кожным студэнтам аб ходзе выканання яго абавязацельстваў не менш аднаго разу ў месяц. Гэта патрабаванне ўнесена і ў палажэнне аб ГПП. Трэба толькі на кожным факультэце распрацаваць канкрэтныя формы і метады яго ажыццяўлення.

**У больш дакладнай пастаноўцы мае патрэбу арганізацыя ўліку грамадскай работы студэнтаў і правядзення грамадска-палітычнай атэстацыі. У цяперашні час дакладна адпрацаванай сістэмы ўліку выконваемай работы па грамадска-палітычнай практыцы на факультэтах практычна няма. Складаемыя штогод асабістыя комплексныя планы пасля атэстацыі студэнтаў калі і захоўваюцца, то на самых «далёкіх» паліцах, куды ніхто не заглядвае. У многіх жа выпадках яны наогул не захоўваюцца. Па крайняй меры, нашы спробы сабраць іх для аналізу за некалькі мінулых гадоў не мелі поспеху. У той жа час для распрацоўкі комплексных планаў**

# ТАВАРЫШ ПЕСНЯ

КОНКУРС вакальна-інструментальных ансамбляў, які прайшоў нядаўна ва універсітэце, стаў першым, на якім аматары сучаснай эстраднай музыкі пазнаёміліся з лепшымі факультэцкімі ВІА. Усяго ў конкурсе ўдзельнічала пяць ансамбляў, але толькі тры з іх (хімічнага, юрыдычнага, і факультэта прыкладной матэматыкі) паказалі праграмы, якія маглі па-сапраўднаму ацэньвацца. Бо ансамблі біялагічнага і радыёфізічнага факультэтаў не змаглі канкурыраваць з апошнімі. Біёлагі не падрыхтаваліся наогул, а удзельнікі ВІА радыёфізічнага факультэта «Ферміён» ігралі так гучна, што нават не было чуваць слоў песень. Дарэчы, гэта ў некаторай ступені з'явілася агульным недахопам усіх удзельнікаў.

Вельмі спадабалася гледачам і журы выступленне музычнага калектыву юрыдычнага факультэта. Яны ігралі свабодна, меладычна.

Крыху горшым, чым у юрыстаў, было выступленне хімікаў, але адчуваецца, што ў іх яшчэ ёсць шмат нявыкарыстаных рэзерваў. Будзем спадзявацца, што ў будучым ВІА хімфака будзе лепшай групай універсітэта.

Выступленне вакальна-інструментальнага ансамбля факультэта прыкладной матэматыкі вызначалася высокім прафесіянальным узроўнем. Але выклікае здзіўленне тое, што ансамбль ФПМ складаецца ўсяго з трох чалавек (ударнік, бас, фартэпіяна). Гэта, безумоўна, збядняе палітру гучання любога сучаснага ансамбля, робіць яго выступленні манатонным і не дае магчымасці для творчага росту і пошуку.

Агляд-конкурс паказаў, што развіццю руху ВІА ва універсітэце трэба надаць больш увагі. Гэта датычыцца і забеспячэння неабходнай музычнай апаратурай кожнага калектыву, і кваліфікаванай дапамогі з боку музыказнаўцаў.

**С. ЛЫСКАВЕЦ,**
**наш спец. кар.**

# Газета выступіла. Што зроблена?

**«ЗВЫЧАЙНАЯ СУБОТА», «НЕ ТАЯ ГУЛЬНЯ» — матэрыялы, у якіх крытыкавалася работа студсавета інтэрната № 2. Нядаўна рэдакцыя атрымала рэагаванне ад старшыні студсавета В. Ламакі. Выступленні газеты прызнаны правільнымі і своечасовымі. Далей паведамляецца: «...у апошні час актывізавалася работа студсавета. На 6-м паверсе адкрыты спартыўны пакой інтэрната, дзе можна пагуляць у тэніс, шахматы і шашкі. У сакавіку-красавіку будуць праведзены першынствы інтэрната па тэнісу, шахматах, шашках, а таксама па футболу і валейболу.**

**Сфарміраваны новы аператыўны атрад...».**

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ПРАКТЫКА: ПРАБЛЕМЫ І МЕРКАВАННІ

**на новы перыяд, калі мы хочам, каб яны адпавядалі мэтам і задачам ГПП, планы тыя сапраўды неабходны. Трэба ведаць, у якіх відах грамадскай работы студэнт удзельнічаў у мінулыя гады, каб прапанаваць яму тую работу, у правядзенні якой ён яшчэ не набыў уменняў і навыкаў, але якія яму патрэбны як будучаму спецыялісту. Значыць, неабходна ўвядзенне адзінай уліковай карткі (кніжкі), у якую б уносіліся ўсе асноўныя выконваемыя студэнтам грамадскія даручэнні за гады вучобы ва універсітэце.**

З парадку дня партыйных і камсамольскіх сходаў, партбюро і камсамольскіх камітэтаў, саветаў па ГПП у апошнія гады не сыходзіць пытанне аб выніках атэстацыі. Прычым заўсёды адзначаецца недастаткова прынцыповы, а іншы раз і ліберальны падыход камісій да ацэнкі работы студэнтаў. На некаторых факультэтах выказваюцца меркаванні і аб вяртанні да адзнак «залічана», «незалічана». На нашу думку, адмова ад дыферэнцыраванай адзнакі непазбежна вядзе да зніжэння грамадскай актыўнасці студэнтаў, якасці выконваемай імі работы. Адзнака «залічана» не дазваляе выдзеліць тых, хто адносіцца да выканання грамадскіх даручэнняў з найбольшай адказнасцю і свядомасцю, праяўляе творчую ініцыятыву, уносіць найбольшы ўклад у арганізацыю грамадскага жыцця ўсяго калектыву.

Выказваліся і меркаванні, што прычынай завышэння адзнак была адсутнасць дакладна распрацаваных крытэрыяў. На біялагічным факультэце намі былі распрацаваны і ўкаранёны дастаткова дакладныя крытэрыі ацэнкі яшчэ ў 1976 годзе (пасля эксперыментальнай праверкі і ўдакладнення яны ўключаны ў палажэнне аб ГПП 1979 года). Аднак пры падвядзенні вынікаў атэстацыі становішча мала ў чым змянілася. Мы пераканаем, што не адсутнасць крытэрыяў вядзе да завышэння ацэнкі, а нізкая якасць асабістых комплексных планаў, недастатковы паўсядзённы кантроль за ходам ГПП. Інакш і быць не можа. Калі на этапе распрацоўкі асабістых комплексных планаў камсамольскія сходы і камітэты зацвердзілі план студэнта, то атэстацыйная камісія павінна ставіць высокую ацэнку і ў тым выпадку, калі студэнт слаба ўдзельнічаў у грамадскай рабоце, але ўсе абавязацельствы асабістага комплекснага плана выканаў. Было б няправільна ў гэтым выпадку прад'яўляць да студэнта патрабаванні, якія выходзяць за межы ўзаконенага асабістага комплекснага плана.

**Думаецца, узровень грамадскай работы і дзейснасць ацэнкі значна павысяцца, калі ўзрасце якасць асабістых комплексных планаў, калі яны стануць канкрэтнымі, абавязацельствы дастаткова рознабаковымі; калі павысіцца ўзровень паўсядзённага кіраўніцтва ГПП.**

У гэтым артыкуле мы імкнуліся звярнуць увагу на некаторыя недахопы ў арганізацыі ГПП студэнтаў, намеціць шляхі іх ліквідацыі. З гэтага не вынікае, што ў цэлым грамадска-палітычная практыка ва універсітэце не ўдасканальваецца. Наадварот, у апошнія гады ёсць зрухі ў справе паляпшэння выхаваўчай работы са студэнтамі. Нашы выпускнікі, аб чым гаворыць знаёмства з іх работай у працоўных калектывах, актыўна ўдзельнічаюць у грамадскай рабоце, задаюць тон у яе арганізацыі. Выкараненне існуючых недахопаў будзе садзейнічаць далейшаму паляпшэнню падрыхтоўкі студэнтаў да грамадскай работы ў працоўных калектывах. Для пошуку шляхоў паляпшэння ГПП студэнтаў трэба аб'яднаць намаганні партыйных і камсамольскіх арганізацый, саветаў па ГПП на факультэтах.

**Г. ЗАХАРЭЎСКАЯ,**
**Л. ЛУК'ЯНОВІЧ,**
**М. МЯЦЕЛЬСКІ,**
**А. ШУКАНАЎ.**

ГІСТАРЫЧНЫ ЛЕТАПІС

# ПАМЯТНАЯ СУСТРЭЧА

*Фальклорны гурток кафедры беларускай літаратуры займаецца не толькі навукова-даследчай работай, але і пастаянна папаўняе фонаархіў факультэта новымі магнітафоннымі запісамі вуснапаэтычных твораў і ўспамінаў многіх людзей пра падзеі мінулага.*

*У 1970 годзе было запісана на магнітную стужку выступленне перад моладдзю ветэрана партыі, дэлегата III з'езда РКСМ Мікалая Уладзіміравіча Разанава. Яго неаднаразова запрашалі на камсамольскія сходы студэнты нашага універсітэта. Мікалай Уладзіміравіч доўгі час працаваў у Беларускім політэхнічным інстытуце ў праблемнай лабараторыі аўтамабіляў.*

*28 верасня 1977 года М. У. Разанаў памёр, але яго захапляючы расказ, запісаны на магнітную стужку, хвалюе сёння кожнага з нас. Мы нібыта самі становімся сведкамі падзей далёкага часу, паўней уяўляем вобраз Уладзіміра Ільіча Леніна, які выступаў на III з'ездзе РКСМ.*

*Прапануем увазе чытачоў частку выступлення М. У. Разанава. Тэкст да друку падрыхтавалі выкладчык кафедры беларускай літаратуры В. В. КАЛАДЗІНСКІ і староста фальклорнага гуртка Г. А. ПАЎЛОВІЧ.*

...ЯРКАЙ старонкай у гісторыі Ленінскага камсамола з'яўляецца выступленне Уладзіміра Ільіча Леніна на III з'ездзе РКСМ.

Напярэдадні адкрыцця з'езда нам стала вядома аб тым, што на з'ездзе будзе выступаць Уладзімір Ільіч. Але аб чым ён будзе гаварыць і якія задачы будзе ставіць перад моладдзю, нам не было вядома, таму што на парадку дня з'езда не значылася яго выступленне. Мы не ведалі, што і думаць, будавалі розныя меркаванні наконт гэтага і былі, безумоўна, вельмі задаволеныя і шчаслівыя, што ўбачым і пачуем голас любімага чалавека, якога большасць з нас ніколі не бачыла і не чула. Людзей было шмат. Адным словам, яблыку не было дзе ўпасці. І вось наступіў момант адкрыцця з'езда. Пётр Смародзін, які быў старшынёй у першы дзень, адкрыў з'езд. Мы зацвердзілі парадак дня, выбралі рабочыя органы з'езда, і тады ён выступіў з прапановай: «Таварышы дэлегаты! Я прапаную некалькі хвілін не пачынаць работу з'езда. З мінуты на мінуту павінен прыехаць Уладзімір Ільіч. Прапаную пачакаць яго і даць слова яму першаму, тым і пачаць работу з'езда». Мы згадзіліся і, чакаючы Уладзіміра Ільіча, пачалі спяваць песні. Бо спяваць мы вельмі любілі. Сядзелі па дэлегацыях, і кожная дэлегацыя запявала якую-небудзь сваю песню. Адны спявалі вельмі дружна і добра, а некаторыя менш зладжана, але ва ўсіх атрымлівалася нядрэнна. Амаль пасля кожнай песні чуліся апладысменты. У зале было шумна. І вось у самы разгар гэтага «спаборніцтва» раптам нехта крыкнуў: «Ленін!!!». Песня адразу ж абарвалася. Погляды ўсіх былі скіраваны на сцэну, на якой ужо паявіўся Уладзімір Ільіч. Ён выйшаў разам з Надзеяй Канстанцінаўнай Крупскай і Анатолем Васільевічам Луначарскім. Апошнія селі ў прэзідыум, а Уладзімір Ільіч падышоў да стала прэзідыума. Як толькі мы ўбачылі Уладзіміра Ільіча, мы ўсе паўскоквалі са сваіх месц. Пачалася бурная, цёплая авацыя ў гонар любімага чалавека. «Ура Леніну!», «Партыі бальшавікоў ура!», «Ура Ільічу!», «Няхай жыве Ільіч!», «Няхай жыве ўлада Саветаў!»— даносілася з розных месц залы. І зноў незмаўкаючыя апладысменты. Кожны з нас хацеў, імкнуўся, як толькі мог, выказаць сваю любоў і адданасць любімаму чалавеку і нашай партыі. Уладзімір Ільіч зняў паліто, павярнуўся да залы і, усміхаючыся, жэстамі рук пачаў нас прасіць спыніць апладысменты. Але з гэтага нічога не атрымалася. Авацыя ўсё нарастала і нарастала. Тады ён дастаў з кішэні гадзіннік, паклаў яго на левую руку і, паказваючы пальцам правай рукі на стрэлкі гадзінніка, зноў прасіў нас супакоіцца, заняць месцы, указваючы на тое, што шмат часу мы трацім дарэмна і што пара распачаць работу. Калі ў зале наступіла цішыня, Уладзімір Ільіч без прадстаўлення стаў перад сталом прэзідыума і пачаў сваю цудоўную прамову «Аб задачах саюзаў моладзі».

...Калі Уладзімір Ільіч сказаў, што асноўная задача моладзі заключаецца ў тым, каб вучыцца, большасць дэлегатаў з'езда, у тым ліку і мы, ваенныя дэлегаты, якія прыехалі з франтоў грамадзянскай вайны,— разгубіліся. Задача, якую паставіў перад намі Ленін,— вучыцца, захапіла нас неспадзявана, да гэтага мы яшчэ сябе не падрыхтавалі. Раней гэта нам і ў галаву не магло прыйсці. Мы думалі, што Уладзімір Ільіч можа заклікаць камсамол яшчэ да адной ваеннай мабілізацыі, для таго, каб хутчэй кончыць з грамадзянскай вайной. Некаторыя меркавалі, што Уладзімір Ільіч будзе заклікаць камсамол да аднаўлення народнай гаспадаркі і прапануе аб'явіць мабілізацыю камсамола на працоўны фронт. Як бачыце, усе прысутныя ў зале памыляліся, і таму заклік Леніна вучыцца прагучаў неяк неспадзявана, мы нават разгубіліся.

Уладзімір Ільіч быў вельмі чулым аратарам і адразу адчуў нашу разгубленасць. Ён пачаў нас пераконваць сваёй ленінскай жалезнай логікай у тым, што задачы, якія ён ставіць перад камсамолам, сапраўды з'яўляюцца найбольш галоўнымі, нягледзячы на тыя цяжкія абставіны, у якіх знаходзілася наша Радзіма. Ён гаварыў нам аб тым, што калі мы называемся Камуністычным Саюзам Моладзі, то ўвесь сэнс нашага жыцця, работы павінен заключацца ў тым, каб падрыхтаваць з сябе актыўных, карысных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

І вось Уладзімір Ільіч паставіў перад намі задачу, расказаў, навошта нам трэба вучыцца, як нам трэба вучыцца і чаму нам трэба вучыцца. Мы імкнуліся пачуць кожнае яго слова. Наша разгубленасць хутка знікла. Уладзімір Ільіч захапіў аўдыторыю і пакарыў яе. І калі ён скончыў сваю прамову, доўга не сціхалі апладысменты. А пасля ён адказаў на нашы пытанні. Іх было шмат. Нас цікавіла ўсё, што адбывалася ў нашай краіне: ход падзей на франтах грамадзянскай вайны, рэвалюцыйны рух на Захадзе... На ўсе пытанні Уладзімір Ільіч адказваў вельмі падрабязна. На з'ездзе Ленін не мог болей заставацца, паколькі быў вельмі заняты ў тыя гады. Ён апрануўся, яшчэ раз павітаў дэлегатаў з'езда, сышоў уніз па лесвіцы і праз залу накіраваўся да выхаду. У гэты час дэлегаты і госці паўставалі з месц, акружылі Уладзіміра Ільіча і задавалі яму пытанні. Завязалася зноў гутарка. І ўсё ж Ленін урэшце пакінуў залу...

Геніяльны чалавек нашай эпохі, чалавек, які паставіў перад моладдзю нашай краіны, перад камсамольцамі задачы па падрыхтоўцы актыўных і карысных будаўнікоў камуністычнага грамадства, паставіў задачы па будаўніцтву камуністычнага грамадства, — быў ён простым і даступным, калі адказваў на запіскі дэлегатаў з'езда, потым калі мы яго праводзілі...

# АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

ФОТАРЭПАРТАЖ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.)**

Як ніколі, шмат спраў у сакратара камсамольскай арганізацыі факультэта Пятра Аксючыца. Трэба і на рэпетыцыю зазірнуць, і абмеркаваць на пасяджэнні камітэта камсамола пытанне аб правядзенні дзён гісторыка ва універсітэце, і на належным узроўні правесці Ленінскі залік у акадэмічных групах...

Словам, ва ўсіх звычайныя клопаты звычайнага працоўнага дня, якія заўтра стане гісторыяй.

**А. СТАДУБ.**
Фота **аўтара.**



ПЛАВАННЕ

# Экзамен на блакітных дарожках

ЗАВЯРШЫЛАСЯ першынство БДУ па плаванню, якое праходзіла ў Палацы воднага спорту. Гэтыя спаборніцтвы ўваходзяць у праграму XXVIII агульнаўніверсітэцкай спартакіяды.

З уступным словам да спартсменаў звярнуўся старшыня спартыўнага клуба Белдзяржуніверсітэта В. П. Шапялевіч. Ён павіншаваў удзельнікаў з пачаткам спаборніцтваў і пажадаў ім поспехаў у вучобе і спорце.

...Выстрал стартавага пісталета. І ў барацьбу ўступаюць удзельнікі заплыву на 100 метраў батэрфляем. Па трэцяй дарожцы плыве студэнт механіка-матэматычнага факультэта майстар спорту С. Грышэль. На фінішы ён паказвае лепшы час дня—1.04,2 мінуты і становіцца чэмпіёнам універсітэта.

На дыстанцыях 100 метраў вольным стылем і 100 метраў на спіне перамаглі адпаведна студэнт фізічнага факультэта, кандыдат у майстры спорту С. Ермаловіч (58,3 сек.) і студэнт біяфака, майстар спорту І. Камлюк (1.09,8 мін).

Пасля першага дня спаборніцтваў наперад выйшла каманда фізфака. Шэсць з паловай ачкоў аддзялялі яе ад неаднаразовых чэмпіёнаў гэтых спаборніцтваў — каманды механіка - матэматычнага факультэта. Але на другі дзень гэты разрыў быў ліквідаваны, і мехматаўцы яшчэ раз даказалі, што іх каманда мацнейшая ва універсітэце. Набраўшы 307 ачкоў, яна заняла першае месца. Другой была каманда фізічнага факультэта (282,5 ачка). Бронзавым прызёрам стала зборная факультэта прыкладной матэматыкі (157,5 ачка). Дарэчы, гэта аказалася вялікай нечаканасцю спаборніцтваў, бо каманда ФПМ ніколі не ўваходзіла ў тройку мацнейшых. Вялікая заслуга ў гэтым намесніка дэкана па фізічнай рабоце на факультэце старшага выкладчыка А. М. Міхнаўца.

Спаборніцтвы яскрава паказалі, што на такіх факультэтах, як фізфак, мехмат, біяфак, ФПМ, ёсць выдатныя плыўцы, якія могуць значна ўзмацніць зборную каманду універсітэта па плаванню.

Але, на жаль, не ўсе факультэты належным чынам аднесліся да спаборніцтваў. Сярод іх каманды журфака, юрыдычнага, філалагічнага факультэтаў. Спартсмены гэтых факультэтаў былі заяўлены толькі ў асобных відах праграмы, ды і якасць іх падрыхтоўкі была вельмі нізкай. Гэта не можа не хваляваць. Спартыўным бюро названых факультэтаў трэба значна палепшыць падрыхтоўку студэнтаў па плаванню.

А. ВЕРАСАЎ.

ФЕХТАВАННЕ

# ПОСПЕХ МУШКЕЦЁРАЎ

НЯДАЎНА ў Магілёве закончылася першынство сярод вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі па фехтаванню. На гэтых спаборніцтвах удала выступіла жаночая зборная рапірыстак нашага універсітэта, якую прадстаўлялі кандыдат у майстры спорту Іна Бышнёва — 3-ці курс ФПМ, члены спортклуба Зіта Счастновіч і Марына Янава. Усе яны сталі прызёрамі.

Каманда рапірыстаў-мужчын заняла 3-е месца. Гонар універсітэта абаранялі кандыдаты ў майстры спорту Анатоль Якубовіч — 5-ы курс юрфака, Аляксандр Лаўрэнаў — студэнт 3-га курса фізічнага факультэта і выкладчык кафедры фізвыхавання майстар спорту Саркіс Элчакян.

— Выступленне каманды трэба разглядаць як поспех,— гаворыць трэнер рапірыстаў майстар спорту па фехтаванню Валерый Шлёнскі.—У спаборніцтвах прынялі ўдзел мацнейшыя зборныя ад 13 ВНУ рэспублікі. Фехтавальшчыкі універсітэта даўно не займалі высокіх месц. Асабліва хацелася б адзначыць поспех Аляксандра Лаўрэнава, які ўпершыню выканаў нарматыў майстра спорту.

Спартыўны год для фехтавальшчыкаў пачаўся няўдрэнна. Чарговыя спаборніцтвы — універсітэцкая алімпіяда. Можна спадзявацца, што яна пройдзе таксама паспяхова.

В. ШАЧАК,
студэнт журфака.

БАСКЕТБОЛ

## Турнір завершаны

ЗАВЯРШЫЛАСЯ жаночае першынство горада Мінска сярод ВНУ па баскетболу. Мінулагодняя чэмпіёнкі рэспублікі, студэнткі БДУ, не зусім удала правялі турнір. Яны прайгралі дзве гульні баскетбалісткам «Гарызонта» і першай камандзе інстытута фізкультуры. Вынік — трэцяе месца. Астатнія месцы занялі спартсменкі інстытута замежных моў, політэхнічнага інстытута і другая каманда фізкультурнага інстытута.

ХАКЕЙ

## Крок наперад

ЗНАЧНЫ крок наперад зрабілі хакеісты БДУ. У фінальным турніры першынства рэспублікі яны «далі бой» лідэрам, значна палепшылі сваё становішча сярод лепшых студэнцкіх каманд БССР. Дзве перамогі над камандамі Віцебскага тэхналагічнага інстытута з лікам 6:4 і Полацкага політэхнічнага інстытута (3:1) вывелі зборную БДУ на шостае месца, што з'яўляецца безумоўным поспехам каманды і яе трэнера Анатоля Дзядзюлі. Добрую, надзейную гульню паказалі варатары Юрый Літвін і Аляксандр Скрыпкін, сапраўднымі лідэрамі каманды былі ветэраны Леанід Забэла і Леанід Вараб'ёў.

ГІМНАСТЫКА

## Са стужкай і абручом

ЗАКОНЧЫЛІСЯ агульнаўніверсітэцкія спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы. Па праграме майстроў спорту перамагла студэнтка другога курса геаграфічнага факультэта Наталля Журко. Другое і трэцяе месца падзялілі Алена Курніловіч (хімфак) і Людміла Гарэлікава (юрфак). Па праграме кандыдатаў у майстры спорту лепшы вынік паказала другакурсніца фізічнага факультэта Алена Цёплая. Другой была Ірына Купіцкая (ФПМ). Юныя спартсменкі, выхаванкі спартыўнага клуба БДУ імя У. І. Леніна, таксама ўдзельнічалі ў гэтых спаборніцтвах. Чэмпіёнкай тут стала сямікласніца 127-й мінскай школы Ірына Нікіценка.

У агульнакамандным заліку ўпэўнена перамаглі гімнасткі фізічнага факультэта.



**Хутчэй, хутчэй! Няўмольны прарэзлівы рокат матораў аглушае наваколле. Час бяжыць! Хвіліна, і ўзлятае магутная металічная птушка. Толькі не ў неба. На зямлі.**

**...Паварот. Яшчэ адзін. Снег пырскае з-пад колаў. І мы ляцім... Фініш! Перамога!! А камусьці не пашанцавала. Спорт ёсць спорт.**

**Фота А. СТАДУБА.**

ДЭЛЬТАПЛАНЕРЫЗМ

# НАБІРАЕ ВЫШЫНЮ

ДЭЛЬТАПЛАНЕРЫЗМ — малады від спорту, але ўжо паспеў заваяваць шырокую папулярнасць сярод людзей, якія захавалі сваю мару аб свабодным лунаючым палёце. Дэльтаплан дазваляе чалавеку ажыццявіць мару ўзняцца ў паветра і з вышыні птушынага палёту адчуць асалоду гармоніі прыроды. Але ў той жа час гэта спорт моцных людзей, гатовых у любы момант сустрэць цяжкасці і весці барацьбу з імі ў паветры.

З мэтай павышэння майстэрства, абмену вопытам быў арганізаваны IV злёт дэльтапланерыстаў БССР, прысвечаны 110-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Злёт праходзіў у пасёлку Ябланіцы Іванава-Франкоўскай вобласці. Гасціннае Прыкарпацце прыняло 62 дэльтапланерысты з Мінска, Гомеля, Слоніма, Мазыра, Віцебска, Брэста. Беларускую сталіцу прадстаўлялі секцыі дэльтапланерыстаў Акадэміі навук БССР, трактарнага завода, Беларускага філіяла навукова-даследчага інстытута навукова-тэхнічнай эстэтыкі, навукова-даследчага інстытута сродкаў аўтаматызацыі, Беларускага політэхнічнага інстытута.

Упершыню на рэспубліканскі злёт выехала каманда Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у састаў якой увайшлі Юрый Красякоў — інжынер кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл, пілот - дэльтапланерыст II класа, кіраўнік секцыі; Уладзімір Самуйлаў — інжынер кафедры фізікі паўправаднікоў, пілот-дэльтапланерыст I класа; Юрый Макуток, Ала Ігнатовіч, Віка Холькіна, Лена Пісарэнка — студэнты II курса фізфака; Андрэй Сазонтаў — студэнт I курса ФПМ. Усяго на злёце зроблена каля 1150 палётаў з перападамі вышынь ад 50 да 200 метраў, выкананы нарматывы пілотаў-дэльтапланерыстаў I і II класаў.

Злёту папярэднічалі тэарэтычныя заняткі па вывучэнню асноў аэрадынамікі, метэаралагічных умоў палёту, тэхнічных характарыстык і патрабаванняў, здача залікаў і трэніроўкі па набыццю асноўных навыкаў палёту на дэльтаплане.

Такім чынам, дэльтапланерызм набірае вышыню. Хочацца верыць, што дэльтапланерная секцыя універсітэта знойдзе новых прыхільнікаў, актыўных удзельнікаў і пры дапамозе грамадскіх арганізацый зможа абараніць гонар універсітэта на спартыўнай арэне.

Ул. САМУЙЛАЎ,
інжынер кафедры фізікі паўправаднікоў,
удзельнік злёту.

СТРАЛЬБА

# Пераможцы вызначаны

ТРЫ ДНІ ў памяшканні універсітэцкага ціра працягваліся спаборніцтвы па кулявой стральбе. Як і чакалася, асноўная барацьба за першае месца разгарнулася паміж камандамі ФПМ, фізічнага факультэта, геафака і юрыдычнага факультэта. Каманды іншых факультэтаў, на жаль, не змаглі быць іх сур'ёзнымі канкурэнтамі.

Пасля двух відаў праграмы лідэрства захапілі спартсмены ФПМ і фізфака — па 58 ачкоў. Усё вырашыла стральба з дробнакалібернага пісталета. Тут стралкі факультэта прыкладной матэматыкі набралі 44 ачкі і, як і ў мінулым годзе, сталі чэмпіёнамі універсітэта. На другім месцы каманда фізфака. Трэцяе месца ў спартсменаў юрыдычнага факультэта.

Фактычна непадрыхтаванымі да спаборніцтваў былі каманды філфака і факультэта радыёфізікі і электронікі, якія паказалі надзвычай слабыя вынікі ва ўсіх відах праграмы.

У. КАПСКІ,
удзельнік спаборніцтваў.



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

АТ 10601. Заказ 515
27 сакавіка 1980 г.

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ